ца XX – начала XXI в. / А. В. Литвинский // Беларусь у кантэксце еўрапейскай гісторыі. – Гродна, 2019. – Ч. 1.
7. Новаковский, В. Проблема присутствия славян на землях в бассейне Одера и Вислы в римский период и в эпоху переселения народов / В. Новаковский // Германия – Сарматия – Калининград – Курск, 2010. – Ч. II.
8. Новосельцев, А. П. Восточные славяне и образование древнерусского государства / А. П. Новосельцев // История России с древнейших времен до конца XVII в. – М., 2000.
9. Платонова, Н. Н. Древнерусская культура и древнерусская элита: проблемы и перспективы исследований / Н. Н. Платонова // Élite ou Égalité – Северная Русь и культурные трансформации в Европе VII-XII вв. – СПб. 2017.
10. Рожанский, И. Л. Славянские суперветви: Y-ДНК как маркер ранних миграций славян/ И.Л. Рожанский // Исторический формат. – 2018. – № 1-2.
11. Яблонский, Л. Т. Рецензия: Клейн Л. С. Этногенез и археология / Л. Т. Яблонский // Российская археология. – 2014. – № 4.
12. inosmi.ru/social/20210508/249681321.
13. svaboda.org/a/29847834.

УДК 947

# САЦЫЯЛЬНЫ СКЛАД УДЗЕЛЬНІКАЎ СТАХАНАЎСКАГА РУХУ Ў ПРАМЫСЛОВАСЦІ БССР У ДРУГОЙ ПАЛОВЕ 1930-х – ПАЧАТКУ 1940-х гг.

**Субоцін А. А.**
установа адукацыі
«Віцебскі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт»
(Віцебск, Рэспублика Беларусь)

Анатацыя. У дакладзе асвячаецца пытанне сацыяльнага складу стаханаўцаў прамысловасці БССР у другой палове 1930-х – пачатку 1940-х гг. Былі зроблены высновы, што большасць стаханаўцаў складалі рабочыя маладога ўзросту, пераважна перасяленцы з вёскі ў горад, з невялікім працоўным стажам і пачатковай адукацыяй. Такія акалічнасці і тлумачаць факт лёгкага ўспрымання гэтымі рабочымі новых форм актыўнай працоўнай дзейнасці, якія прымяняла дзяржава ва ўмовах фарсіраванай індустрыялізацыі.
Ключавыя словы: стаханаўскі рух, БССР, прамысловасць, стаханаўцы, сацыяльны склад.
Summary. The report highlights the issue of the social composition of Stakhanovists of the industry of BSSR in the second half of the 1930s – early 1940s. It was concluded that the majority of Stakhanovists were young workers, mostly relocated from countryside to the towns, with little work experience and primary education. Such circumstances explain the fact that these workers easily accepted new forms of labor activity, which were used by the state in the conditions of forced industrialization.
Keywords. Stakhanov movement, BSSR, industry, Stakhanovists, social composition.

Стаханаўскі рух узяў свой пачатак у 1935 г. і быў адзначаны звышактыўнай працай рабочых, якія не толькі перавыконвалі планы ў два і болей разы, але і прымянялі на практыцы новыя метады ўдасканалення вытворчасці. Акрамя пытанняў, звязаных з уплывам стаханаўскага руху на развіццё эканомікі БССР у гады другой і трэцяй пяцігодак, вывучэнне гэтай формы сацыялістычнага спаборніцтва таксама патрабуе аналізу сацыяльнага складу яго ўдзельнікаў, што пэўным чынам адлюстроўваў тыя грамадскія працэсы, якія адбываліся ва ўмовах фарсіраванай індустрыялізацыі.

Большую частку ўдзельнікаў стаханаўскага руху ў прамысловасці БССР у другой палове 1930-х – пачатку 1940-х гг. складалі прадстаўнікі маладога пакалення рабочых. Так, сярэдні ўзрост стаханаўцаў складаў 25 гадоў. На студзень 1936 г. па выбарачнай праверцы ўзроставага складу стаханаўцаў на 16-ці прадпрыемствах Віцебска было выяўлена 65,5% стаханаўцаў, узрост якіх быў меншы за 30 гадоў [3, арк. 50]. Сярод 438 стаханаўцаў прамысловасці Аршанскага раёна ў канцы 1935 г. 259 чалавек былі ва ўзросце ад 18 да 30 гадоў (59,1% ад агульнага складу) [12, арк. 131]. З 90 стаханавак БССР, прадстаўленых да ўзнагароды ў сувязі з Міжнародным жаночым днём у 1936 г., ва ўзросце ад 17 да 25 гадоў былі 34 стаханаўкі, ва ўзросце ад 25 да 30 гадоў – 15, ва ўзросце ад 30 да 40 гадоў – 16 і ва ўзросце больш за 40 гадоў – 6. Узрост астатніх стаханавак не быў вызначаны [13, арк. 7−16].

Сярэдні працоўны стаж большасці стаханаўцаў прамысловасці складаў 3 гады. На самым пачатку разгортвання стаханаўскага руху, 17 кастрычніка 1935 г., у першым хромавым цэху Мінскага гарбарнага завода «Бальшавік» стаханаўцамі сталі 55 чалавек, сярод іх працоўны стаж меншы за 1 год мелі 10 рабочых, ад 1 да 5 гадоў – 21 рабочы, ад 5 да 10 гадоў – 11 рабочых [15, арк. 169–170]. Па Рагачоўскім лесазаводзе на 13 снежня 1935 г. налічвалася 25 стаханаўцаў. Працоўны стаж 2 стаханаўцаў складаў менш за 1 год, 14 стаханаўцаў адпрацавалі ў прамысловасці ад 1 да 5 гадоў [11, арк. 30]. У спісе стаханаўцаў БССР, што былі камандзіраваны Цэнтральным саветам прафесійных саюзаў Беларусі ў Маскву на майскія ўрачыстасці 1936 г., большая частка мела працоўны стаж меншы за 5 гадоў [14, арк. 2–6].

Як вынік, у стаханаўскі рух пераважна ўключалася тое пакаленне, працоўная дзейнасць якога пачалася ў гады фарсіраванай індустрыялізацыі, а рэвалюцыйныя каштоўнасці папярэдняга пакалення набывалі ў яго новыя якасці, максімальна накіраваныя на актыўныя пераўтварэнні ў вытворчасці. Станаўленне прадстаўнікоў маладога пакалення рабочых як асоб адбывалася менавіта ў савецкіх умовах, калі вызначаныя дзяржавай планы па пабудове сацыялізму станавіліся для іх базавымі каштоўнасцямі і стала замацоўваліся ў працоўнай дзейнасці, імкненні ж зрабіць татальныя змены ў вытворчай сферы і ў грамадстве ў цэлым праяўляліся ў іх больш яскрава, чым у рабочых, жыццёвы вопыт якіх склаўся яшчэ ў дарэвалюцыйны час. Даследчык рабочага класа А. Удовін вызначаў у гэтым сэнсе, што для фарміравання псіхалогіі кваліфікаванага прамысловага рабочага быў неабходны вытворчы вопыт больш за 5 гадоў, але ў маладых людзей, што ўдзельнічалі ў стаханаўскім руху, нягледзячы на іх невялікі працоўны стаж, станаўленне псіхалагічных рыс савецкага рабочага класа адбылося за больш кароткі тэрмін і вельмі хутка сфарміраваліся матывы да ўдасканалення вытворчых працэсаў [2, с. 108–109].

Сацыяльную базу для стаханаўцаў прамысловасці складалі ў асноўным перасяленцы з вёскі ў горад, выхадцы з найбяднейшага сялянства, серадняков [9, с. 206]. Асабліва яскрава гэта прасочваецца менавіта на прыкладзе БССР, дзе да пачатку індустрыялізацыі канца 1920−30-х гг. пераважала сельскае насельніцтва і новы склад рабочых папаўняўся, пачынаючы з першай пяцігодкі, перш за ўсё за кошт былых сялян. У Полацкай лесахімічнай арцелі «Труд» (на 2 лютага 1936 г.) толькі 2 стаханаўцы з 11 былі рабочымі па сацыяльным паходжанні [5, арк. 45]. На Чашніцкай папяровай фабрыцы «Чырвоная зорка» (на 5 снежня 1935 г.) 9 з 27 стаханаўцаў вызначаліся па сацыяльным паходжанні як рабочыя [4, арк. 7−8]. Па дадзеных снежня 1936 г. 32 рабочыя-стаханаўцы з 39-ці на Азярэцкім лесазаводзе былі выхадцамі з сялян [17, арк. 4–5].

У гэтым выпадку асаблівую ролю ў праяўленні стаханаўскага энтузіязму адыгрываў фактар змены сацыяльнага акружэння ў выніку перасялення з вёскі ў горад. Як адзначае расійскі гісторык У. Булдакоў, у такой сітуацыі вялікія масы людзей − носьбітаў архаічнай псіхаментальнасці, трапіўшы ў гарады, у складаны час урбанізацыі і індустрыялізацыі адказвалі на змену сваёй культуры актывізацыяй сваёй дзейнасці [1, с. 33]. У рабочых, што былі перасяленцамі з вёскі, не сфарміравалася да канца прафесійная культура, таму яны з лёгкасцю ўспрымалі карэнныя змены ў вытворчых працэсах, ажыццяўленне якіх магло замацаваць іх прэстыж у працоўным калектыве.

Вялікі працэнт сярод удзельнікаў стаханаўскагу руху ў прамысловасці БССР складалі прадстаўнікі жаночага полу. Гэта было абумоўлена тым, што з канца 1920-х гг. у індустрыі рэспублікі асабліва актыўна «фемінізацыя» адбывалася ў вядучых для яе галінах лёгкай прамысловасці: трыкатажнай, швейнай, тэкстыльнай і гарбарнай, і пры разгортванні з сярэдзіны 1930-х гг. стаханаўскага руху як новай формы сацыялістычнага спаборніцтва па ўдасканаленні працы і павышэнні яе прадукцыйнасці большасць прамысловых работніц рэспублікі сталі стаханаўкамі менавіта ў гэтых галінах. Так, на красавік 1936 г. на Мінскай скургалантарэйнай фабрыцы імя Куйбышава сярод стаханаўцаў жанчыны складалі 80,9%, а на Мінскай трыкатажнай фабрыцы – 95,9% [10, арк. 75]. На Гомельскім аўчынна-шубным заводзе сярод 25 удзельнікаў стаханаўскага руху (на 25 снежня 1935 г.) было 19 жанчын [16, арк. 3]. Большая частка работніц сярод герояў вытворчасці была і на швей-

най фабрыцы «Сцяг індустрыялізацыі», дзе на сакавік 1936 г. з ліку 419 стаханаўцаў было зафіксавана 360 жанчын [8, с. 3]. Перавага жаночай занятасці ў галінах лёгкай прамысловасці і вялікі працэнт у іх жанчын сярод удзельнікаў стаханаўскага руху тлумачыцца тым, што вытворчыя аперацыі, якія выконваліся тут, былі блізкімі па сваім характары да звычайных хатніх работ і, такім чынам, мелі патрэбу ў асноўным у жаночай працоўнай сіле.

Высокі ўзровень занятасці жанчын назіраўся і ў такіх вядучых галінах прамысловасці рэспублікі, як дрэваапрацоўчая і харчовая, дзе прадстаўніцы жаночага полу таксама актыўна праявілі сябе як стаханаўкі, пераважна на дапаможных аперацыях і на працэсах, якія не былі разлічаны на авалоданне складанай тэхнікай. Так, у снежні 1935 г. па спіртавых заводах рэспублікі колькасць удзельнікаў стаханаўскага руху складала 937 чалавек, сярод якіх жанчын было 227 [20, с. 20–21]. Вядомыя ў БССР стаханаўкі З. Таболіна і М. Цыгельніцкая былі, напрыклад, работніцамі кандытарскай фабрыкі «Камунарка». З. Таболіна ўдасканаліла працэс глазіроўкі кандытарскіх вырабаў і выконвала норму на 517%, а М. Цыгельніцкая на працэсе ўпакоўкі гатовай прадукцыі, дзякуючы добрай арганізацыі свайго працоўнага месца і своечасовай падрыхтоўцы неабходных матэрыялаў, выпрацоўвала больш за 190% нормы [19, с. 26, 33]. Рэспубліканскую вядомасць атрымалі і стаханаўкі каробачнага цэха Барысаўскай запалкавай фабрыкі Б. Блох, Я. Дзеравяга, М. Кішкурка, якія перайшлі на новыя метады працы і дабіліся выканання норм на 400% [18, с. 20, 21, 24].

Большасць удзельнікаў стаханаўскага руху пры наяўнасці вялікага працоўнага энтузіязму і прымяненні ўдасканаленых метадаў у вытворчасці першапачаткова мала валодалі менавіта тэарэтычнымі ведамі з тэхнічных дысцыплін і мелі звычайна пачатковую адукацыю. Так, напрыклад, адна з найлепшых стаханавак Горацкага раёна Г. Каліво мела толькі 4 класы пачатковай школы [7, арк. 10]. З 25 найлепшых стаханаўцаў Мазырскага раёна на снежань 1935 г. толькі трое рабочых скончылі 7 класаў агульнаадукацыйнай школы, а двое рабочых – курсы фабрычна-заводскага навучання [11, арк. 30–31]. На пачатак 1936 г. 7 з 8 найлепшых стаханаўцаў Бабруйскага дрэваапрацоўчага камбіната былі непісьменнымі і малапісьменнымі [6, арк. 169].

Такім чынам, у стаханаўскі рух у прамысловасці БССР у другой палове 1930-х – пачатку 1940-х гг. уключылася новае пакаленне рабочых, дзе большасць складала моладзь, у асноўным перасяленцы з вёскі ў горад, з невялікім стажам працы ў грамадскай вытворчасці і пераважна пачатковай адукацыяй. Такі сацыяльны склад тлумачыць актыўнае ўключэнне азначаных працоўных у сацыялістычнае спаборніцтва і лёгкасць успрымання імі новых форм арганізацыі працы, якія ўкараняла дзяржава ў эканоміцы. Разгортванне стаханаўскага руху дазволіла праявіць сябе ў грамадскай вытворчасці жанчынам, якія складалі большасць сярод стаханаўцаў БССР у лёгкай прамысловасці, а таксама аўктыўна ўдзельнічалі ў сацыялістычным спаборніцтве ў харчовай і дрэваапрацоўчай галінах.

**Літаратура**


1. Булдаков, В. П. Красная смута. Природа и последствия революционного насилия / В. П. Булдаков. – М. : РОССПЭН, 1997. – 376 с.
2. Вдовин, А. И. Социалистическая реконструкция народного хозяйства СССР и социальная психология новых пополнений рабочего класса / А. И. Вдовин // Рабочий класс и индустриальное развитие СССР : сб. ст. / АН СССР, Ин-т истории СССР ; редкол.: А. В. Митрофанова (гл. ред.) [и др.]. – М., 1975. – С. 101–110.
3. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці (ДАВВ). – Ф. 102. Воп. 1. Спр. 365.
4. ДАВВ. – Ф. 105. Воп. 2а. Спр. 138.
5. ДАВВ. – Ф. 10061. Воп. 2. Спр. 31.
6. Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Магілёўскай вобласці (ДАГАМВ). – Ф. 2952. Воп. 1а. Спр. 407.
7. ДАГАМВ. – Ф. 6115. Воп. 1. Спр. 418.
8. Зарубежны, А. Стаханаўкі швейнага гіганта / А. Зарубежны // Звязда. – 1936. – 8 сак. – С. 3.
9. Кораблев, И. Г. Роберт Майер. Стахановское движение. 1935–1938 гг. Стахановское движение как катализирующий фактор сталинизации советского общества / И. Г. Кораблев // Отечест. история. – 1992. – № 6. – С. 204–207.
10. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 4п. Воп. 1. Спр. 8965.
11. НАРБ. – Ф. 265. Воп. 1. Спр. 4238.
12. НАРБ. – Ф. 265. Воп. 1. Спр. 4409.
13. НАРБ. – Ф. 265. Воп. 1. Спр. 4447.
14. НАРБ. – Ф. 265. Воп. 1. Спр. 4448.
15. НАРБ. – Ф. 283. Воп. 1. Спр. 673.
16. НАРБ. – Ф. 283. Воп. 1. Спр. 674.
17. НАРБ. – Ф. 509. Воп. 1. Спр. 19.
18. Стаханаўскім шляхам: стаханаўцы Барысаўскай запалкавай фабрыкі : [зб. арт.]. – Мінск : Дзярж. выд-ва Беларусі, 1936. – 64 с.
19. Стаханаўцы "Камунаркі" : [зб.]. – Мінск : Дзярж. выд-ва Беларусі, 1936. – 64 с.
20. Стахановцы спиртовой промышленности БССР : [сб.]. – Минск : Гос. изд-во Белоруссии, 1936. – 78 с.